10а
68734

15а
68734

*Загляне сонцэ
і ў нашэ ваконцэ".*

# МОДНЫ ШЛЯХЦЮК.

Бытовая камэдыя ў 1-ым дзеі.

*Напісаў К. Каганец.*

Бел. сдача
1994 г.

Цэна 25 кап.

ПЕЦЯРБУРГ.
1910.

# МОДНЫ ШЛЯХЦЮК.

## Асобы:

ГАСПАДАР ЯН.
ЯКУБ, сват Пранцішка.
ГАННА, дачка Яна.
ПРАНЦІШЭК } шляхцюкі з другога засьценку.
ІГНАСЬ -
АНДРЭЙ, сват Ігнася.
СУСЕДЗІ Янавы.
/Усё дзеецца ў хаце Яна /.

## З Ь Я З А І.

ЯН і ЯКУБ, седзючы за сталом, выпіваюць, закусываюць і вядуць гутарку.

ЯН. /Прапівае і налівае Якубу/. Пій на здароўе!

ЯКУБ. Будзь, вашэ /прыймае чарку/, здароў!

ЯН. Пій на здароўе!

ЯКУБ. Так то яно то.../Глядзіць на чарку/. Так, так, так /Уздыхае/. А ўсё-ж та людзку не выходзіць...

ЯН. А што там за беда такая?

ЯКУБ. Беда - не беда, а так, што яно не так, як трэба.

ЯН. Дык пійце-ж, пане браце! При чарцы і выскавацъ лягчэй будзе.

ЯКУБ. Ну, дай, Божэ, каб усё было гожэ. /Выпівае і наліваеЯну/. Э, Яне, Яне!

ЯН. А што?

ЯКУБ. Дзела, бачыш, маю.

ЯН. Ну, дык кажы, што так за дзело такое.

ЯКУБ. /Скрабучыся за вухам/. Так,- бачыш ваша,- я якза дзелам, а і пачацъ ня ведаю с чаго...

ЯН. Будзь здароў, пане браце. /Пъе і наліваe/. Так скапане браце, якое такое труднае дзело маеш. Але перш чаку выпій.

ЯКУБ. Дзякую. Калі-ж неяк і піці сорамна.

ЯН. Чаму так? Чым хата багата, тым і рада.

ЯКУБ. Дзякую, дзякую!

ЯН. Я, бачыш, велімі ўпрашываць ня ўмею.

ЯКУБ. Ды не аб тое. Здаецца, не цяпер мы знаемся.

ЯН. Так чаму-ж гэта ты?..

ЯКУБ. Я, бачыш ваша, на добры лад павінен бы сам даз гарэлкаю прыйсьці. А так то і пачаці ня ведаю с чаго

ЯН. Та-а-ак! Вось яно што...

ЯКУБ. Да ўжо-ж...

ЯН. Праўда, што яно трохі не па людзку. А дзе-ж вашладзец. Чаму ён не прыехаў.

ЯКУБ. Га, мода цяпер такая.

ЯН. Мода - модаю, а звычай - сьвятое дзело.

ЯКУБ. За тым то і мне так цяжка. Ці то мне першыня сватацца. Ці мала я на сваім вяку паненак кабетамі зрабіў. Бо, па праўдзі сказаўшы, ў сватаньні шчасьце маю. Адно цяпер неяк язык у роце вязьне.

ЯН. Так, так...

ЯКУБ. Сам ня ведаю, што рабіць; але мой кавалер так закацеў.

ЯН. Кепска, кепска...

ЯКУБ. Кажэ, што мода цяпер такая, што па нашаму не сватаюцца. А ён-жэ ў гэтым дзеле маракуе, бо хлопец вучоны, шмат сьвету бачыў, у горадзе бываў, уселякіе навукі набраўся, дык ужо і не жыве па нашаму, але с культураю.

ЯН. А што гэта такое?

ЯКУБ. /Засароміўшыся, заікаецца/. Ну ку-уль-куль-ту-у-рра.

ЯН. Куль-куль-куль... Нешта я гэтаго ніяк не ўцямлю. Што эта: баба якая, ці што?

ЯКУБ. /Заклапочэны/. Па праўдзі сказаць, то я і сам ня ведаю, што гэта такое.

ЯН. Ну, дык чаму-ж гаворыш ты, чаго ня ведаеш сам. На ліха нам тые выдумкі заморскіе. Ці ў нас сваіх слоў не хватае?

ЯКУБ. Ня гневайся, вашэць: гэта ён мяне так навучыў, каб адразу відаць было, што ён не абы які кавалер.

ЯН. Ого-го! Штось мне не спзнараўна. А хто ён такі, ваш

... заморскі паніч?

КУБ. Пранцішэк.

... які Пранцішэк? Адкуль?

... Ды гэты, з Вішнёўкі, Карчэўшчык.

... а-а-а! Гэта Антонага, вечны яму пакой, сын. Г...

... о гаспадаркі ня любіць, і найболей у горадзі ...

... Для навукі, бачыш, усё.

... аю я, якой навукі: у карты гуляць, гарэлку піць,

... і валачыцца - вось гэткіх панічоў навукі.

... не ён казаў, чаго ён так вучыцца, але штось ня ...

... жала калісь праўда, ка іржа ззела.

... Ну, дык як-жэ будзе?

... абачымо.

... і дачцы скажыце, каб не працівілася. Усё-ж го...

... бывалы, дэлікатны, - не так як нашы засьцянковые

... кі няволіць ня буду. Як яна спадабае. Адну т...

... Яна у мяне і дома гаспадыня, і у полі работні...

... зіця. Вольнаю волю мае. Каб я толькі недаў, шт...

... добры, не лайдак, то перашкод рабіць ня буду.

... Так то яно так. Але растлумачце ей, што гэта

... хлопец, а вучоны.

... не то тамака вучоны, вучоны. Хочэце, - самі нама...

...Е. Я гаварыць ня буду.

...КУБ. А мо і пагаварыць з ёй...

...ЯН. /Клічэ/. Ганна, а, Ганна! Хадзі-тко, дзетка, сюды.

ЗЬЯВА II.

ГАННА. /Убегае басая, падкасаўшыся, з дзеркачом у руках; убачыўшы чужога, засароміцца, абцягнула спадніцу і стала ў качарэжніку/. Тато мяне клікалі?

...ЯН. Але! Вось, пан Якуб с табой пагаварыць хочэ.

ГАННА. /Утаропіўшыся/. Пан Якуб?!.

ЯКУБ. Што, паненка, на мяне так дзівішся? Сядзь лепей, пагаворым.

ГАННА. Дзякуй, я магу і стоячы паслухаць.

...КУБ. /Заклапочэны, памаўчаўшы/. Памажэце, вашэ, паче Яне.

...ЯН. Бачыш, Ганна! Францішэк Карчэўшчык да цябе свата прыслаў.

ГАННА. /Саромліва павярнуўшыся да печы, нішчыком усьмехаецца і маўчыць/.

...КУБ. Ну, што-ж паненка на гэта скажэ?

ГАННА. /Прыкідываючысь незнайкою/. Ня ведаю.

...КУБ. Падумай, паненка: ён жэ і вучоны, і дэлікатны, - і па-польску, і па-расейску гаварыць умее. Будзеце ў горадзі жыць, с панамі таварыство вадзіць.

ГАННА. У-у-га! /Як-бы да сябе/. Так многа!

...КУБ. Будзеш, паненка, ў дарагіх сукнях хаджываць, дэлі-

катную страву есьці... Ну, дык што-ж, паненка, маўчыш
жы: пойдзеш за Пранцішка?

ГАННА. Ня ведаю.

ЯКУБ. Не саромяйся, паненка.

ГАННА. На што мне гэта ўсё? Ці мне ў бацькі дрэнна?

ЯН. Дрэнча - нл дрэнна, але векаваць пры мне ня будзе
Трэба-ж калі нібудзь замуж выйсьці.

ГАННА. Ваша, тато, воля, - але пры вас я бы ахватней астал

ЯКУБ. А каліб вам у горадзі добра пайшло, дык і бацьку
лі-б к сабе. Бацька на старасьці супачыўбы ад працы. У
радзі і памаліцца ёсьць гдзе...

ЯН. Бог усюды ё, а ў горадзі мне не прынадна. Дый сам
шэць, я думаю, ня вельмі-б то у горадзі рад жыў.

ЯКУБ. Яно то так; я бы ў горадзі ня мог жыць; бо ўжо
ры - цяжка прывыкаць. А маладым то другое.

ЯН. Ну, Ганна! А што ты на гэто?

ГАННА. /Маўчыць, адно край хвартушка зубамі цярэбіць/.

ЯКУБ. Бачу, што с паненкаю да ладу не дайду, бо саро
ца, - а свае дзело я споўніў, дый то толькі праз памя
нябошчыка бацьку Пранцішковаго, бо сам бы я за гэтака
таўство не ўзяўся. А цяпер, людцэ добрые, аставайцеся
ровы, хай бацька з дочкаю парадзяцца добра, а Пранці
сам па адповедзь прыйдзе, калі ў яго мода такая. Быва
здаровы!

ЯН. Ідзіце з Богам здаровы! /Якуб выходзіць/.

## З Ь Я В А III.

ЯН. Ну, што-ж, Ганулял? Пайшла-б за Пранцішка?

ГАННА. /Энэргічна/. Да куды там?!

ЯН. Але што с таго будзе, што ўсім атказываеш?

ГАННА. /Прыбераючы хату/. Ці-ж бо мне дома кепска. Тато-ж мяне не праганяеце...

ЯН. Добра, але ўсё-ж такі век маладая ня будзеш, а як пастарэеш, хто цябе тады возьме. Я ўжо стары, ўжо столькі не пражыву, колькі пражыў. Як прыдзецца рукі злажыць, то хто тады табе ў помач стане. Гаспадарку разарвуць цябе пакрыўдзяць... Старасьць - не радасьць.

ГАННА. Пажывеце, тато, пажывеце.

ЯН. Я ведаю: ў цябе ў галаве Ігнась.

ГАННА. Ігнась - не Ігась, а за Пранцішка не пайду.

ЯН. То чаму-ж свату зразу не сказала?

ГАННА. /З абідаю/. А гдзе хто бачыў, каб дзеўка с сватам гаварыла? Гэта-ж сорам! Тагды-б мяне на засьценку засьмеял

ЯН. Яно то праўда, што табе неяк не выпадае.

ГАННА. Але тату то я ўсё скажу, як на споведзі. Не пайду за Пранцішка, бо тут яго ўсе знаюць, як аблупленага ката. Усе з яго толькі кпяць і сьмяюцца. Ніхто аб ім дабраго слова не скажэ. Ходзіць па-моднаму, ўвесь у чорным, сур-

дут доўгі, з-заду разрэзаны... Не раўнуючы, як той чор

ЯН. Бачыш яго! А я гэтага і ня ведаў!

ГАННА. Бо тата ўсё або ў полі, або ў хаце. А я ведаю, б раз яго спатыкала. Як сустрэну яго на вуліцы, дык кожы раз ажно жахнуся. А сабакі ненавідзяць яго горш, як воў Часам за паўвярсты ад засьценку дагоняць яго цы калошы паабрываюць. Цьфу! Сабака яго ня можэ сьцярпець, а я б мела за яго зя муж ісьці...

ЯН. Кажуць, што вучоны.

ГАННА. Вучоны, вучоны! Бульбы ад рэпы не распазнае. А ворыць дык так, што і зразумець яго трудна. Нашае мовы саромяецца.

ЯН. Гэта брыдка! Але хацелася-б мне зяця прычэкаць,- у каў бы гадаваў.

ГАННА. Прычэкаеце, прычэкаецце.

ЯН. Цяжка, бачыш, з гаспадаркаю ўпраўляцца, а наймит - свой чэлавек: і дорага каштуе, і на старану гатоў што рэдаць, ведама чужы.

ГАННА. Але! А хочэце мяне ў горад аддаць. А хто ў вас гаспадыню будзе, хто каровы падоіць, хто сьвіньні пак міць? Хто страву вам зварыць? Хто з жнейкамі ў постаці не?

ЯН. Я цябе не няволю.

ГАННА. Тут я радзілася, тут і матуля мая пахавана, ту

і астануся. Хто-б тагды магілку матчыну прыбраў. Зарасла-б яна дзікім зельлем, а вам бы матка супакою не дала за тое, што мяне ад яе адлучылі... /Плачэ/.

ЯН. /Разжалены/. Не плач-жэ, не плач. Я-ж цябе не прымушаю. Мне-й самому дужэ ён не падабаецца. Дый цяжка мне ужо аставацца аднаму. Ведаю, пра Ігнася думаеш, дый нешто-ж ён маўчыць дагэтуль, не сватаецца.

ГАННА. Але і да іншых не ўдаецца.

ЯН./Сьмяючыся/. А ты-б яго хацела./Ад якойсь пары ўжо сабакі брэшуць/.

ГАННА. Мала-бы што, ды мне і з вамі добра.

ЯН. Але каго гэтак сабакі апанавалі? Выскачы дачушка, глянь, каго яны так тамака бяруць? /Ганна выходзіць/.

## З Ь Я В А IУ.

/Ян, зняўшы с кручка кажук, падкінуў сабе пад галаву і прылёг за сталом на лаві, так што яго ня відно ад дзьвярэй. У хату ўскаківае, ўцекаючы ад сабак, Пранцішэк - блежны, задыхаючыся; ён у чорным сурдуціку, ў чорных нагавіцах, у белых рукаўчыках і каўнерыку/.

ПРАНЦІШЭК. /Азірнуўшыся на хаці/. І тут нікагусенька. А, псямаць іх, чуць мне сурдута ня зьелі. Цэлых пяць рублёў жыду аддаў за яго, але на такіе залёты дык і то дорага. /Падышоў к лаві і зьметае яе хустачкай/. Але жыць тутака

- то я бы ня жыў. Забяру Ганну ў горад, дам сабе з ею рады, каб толькі пасаг у рукі як прыбрацъ - восъ што.

ГАННА. /Прачыніўшы дзъверы/. Тата тут? /Убачыўшы Прапцішка/. А-а-а! А гдзе тата?

ПРАНЦІШЭК. Не вем... Добры вечэр, паненка! А на цо то паненка таты шукае? Можэ мы і без таты моглісь-бы паразмавяць. Я наўмысьле тэго пшышэд.

ГАННА. А аб чым мы маем газарыць? Калі якое дзело маеце, тата на тое...

ПРАН. /Прыдзержываючы Ганну за руку/. Але нехай паненка пачэка. Без таты нам бэндзе свабодней; паненка ве, што пры тату не вшыстко можна робіць. /Памаўчаўшы/. Паненка ужо ве, чаго я ту пшышэдэсь.

ГАННА. Не, ня ведаю!

ПРАН. Як то? Прэце-ж ту был пан Якуб, он мне мувіл...

ГАННА. /Нецярпліва/. Што вам пан Якуб гаварыў, таго я не магу ведаць.

ПРАН. Але-ж, паненка, я ту пшушлэсь до паненкі в сваты, а паненка гневася на мне, як на злэго.

ГАННА. А ці-ж у сваты хто гэтак ходзіць і сорам дзяўчыні прычыняе, і дзъверы заступае?!

ПРАН. Цо бо то паненка до мнэ, як до хлопа, гада. Чы бы т мы не моглісь фізычней паразмавяць. Прэце-ж паненка такі шляхэтна эстэсь, а то по-простэму і по-простэму.

ГАННА. Нехай сабе і "па-простэму". Няўжо-ж крыва лепш, як проста?

ПРАНЦІШЭК. Я, відзі паненка, не естэсь просты. А вшистко такі цоколек розумем. Я ў месьці да школы ходзілэсь. З ружнымі панамі знамся. Так паведзявшы, я чловек с культуро, выкшталцоны естэсь,- так то мне неякось не выпадае так па-хлопску гадаць: гале, ды гале.

ГАННА. Та чаму-ж, паніч, у сасьцэнак прыходзіш? Нам гэтаго ўсяго ня трэба - гэтых цвізыкаў ды культураў. Нам досі нашае мовы, нашых звычаеў.

ПРАН. Э! то так?! То паненка мне не хцэ? Пачэкай, паненка, я патрафя паненка намувіць, што і маей бэндзеш, і нікому ані пісьнеш... /Хочэ злавіць яе /.

ГАННА. Што гэта?! Адчапіся!.. Разбойнік! Шалёны!.. /На сцэне тузаніна, а тым часам з-за стала ўстае Ян/.

ПРАН. /Убачыўшы Яна, пускае Ганну і гвалтуе/. Гэй, людзі! Ратуйце!.. Ратуйце!..

ЯН. /Падыходзіць з гневам/. А гэта што?../Ад гневу ня можэ гаварыць/.

ПРАН. А, пан?! - Аткуль гэта пан?.. Чы то пан тутэйшы? - Ратуйце! Памажыце!.. Гэта дзяўчына шалёная, ці якое ліхо... Забіць хочэ...

ЯН. Вон, паганец!.. Віш, ты! Брэхаць будзе... Вон, каб і нага твая тут не была!.. Я-б с табой іначэй пагаварыў, але

абразы шаную і звичай сьвяти. Адно вынасіся швидчэй, а то часам і ня вытрываю.

ПРАНЦІШЭК. /Адступаючы да дзьвярэй, н сабе гаворыць/. Ну еичэ добра скончилося... Я баюся, каб не было горэй...

/Шмигнуў за дзьверы/.

ЗЬЯВА V.

ГАННА. /Туліцца к бацьку/. Балазе, татачка, вызваліўлі мяне ад гэтаго гада.

ЯН. Дык праўду казалі аб ім, што не самавіты. Вось табе і модкае сватоўство!

ГАННА. /Ўтаропіўшыся/. Ціха, тато!

ЯН. А што там?

ГАННА. Як-бы званок чутно, чуеце?

ЯН. /Слухаючы/. Але ж. Пошта, ці што?!

ГАННА. Як-бы са шляху зьвярнулі. /Глядзіць у вакно/.

ЯН. Зноў беда якая, ці што. Да каго-ж бы гэта? Хіба што не да нас... Дык хто?..

ГАННА. /Стаіць ля вакна/. А мо і да нас. /Раван зрадзеўшы/. Татачка! Да гэта-ж сваты. І да нас, да нас! Ужо і Бэйшэраву хату мінулі...

ЯН. /Паглядаючы ў вакно/. Праўда! Во, гэта дык па-людзку і гаспадарску.

ГАННА. А што, тато? Ці-ж не казала? Вось і сваты!

ЯН. Але коні добрые. Ды хто-ж бы то?

ГАННА. Ігнась! Ігнась са сватам едзе!..

ЯН. Ідзі-ж, дзеўка прыгарніся трохі, бо растрэпалася, гэтым злодзеем тузаючыся.

ГАННА. Што гэта сяголньня?! Ажно галава кругом пайшла... /Выбегае/.

## З Ь Я В А VI.

/Ян ходзіць неспакойна па хаці. Дзьверы адчыняюцца і ўвайходзіць сват Андрэй/.

АНДРЭЙ. Хай будзе пахвалёны!

ЯН. На векі векаў! Што гэта, куме: ці ня воўк здох, што ўгэшці ўспомніў аба мне? Гэтулькі часу і носа ня ткнуў.

АНДРЭЙ. Часу, кумочку, не было. Далі-Бог, колькі разоў зьбіраўся, ды ўсё неяк не выходзіло.

ЯН. Эй, гавары, куме!.. Вось седай лепей і кажы што чуваць? Як баба маецца? Як дзеткі?

АНДРЭЙ. Дзякую! Пічагутка, жывемо памаленьку. - Як сам? Як дачка?

ЯН. Здаровы, дзякаваць Богу. Але седай-жэ нарэшці!

АНДРЭЙ. То і дзякаваць. А калі будзеце рады купцом, дык сяду?

ЯН. Да ўжо-ж, хто мае тавар, той і купцом рад. Што да цэны, то ці зойдземся, - а так ласкаве просім.

АНДРЭЙ. Калі так, то і аб цэну зьмяркуемся, дасьць Бог. /Садзіцца і ставіць на стол пляшку/. Так значыць, ты не праціўен, куме?

ЯН. Што я? Ня мне-ж з Ігнасём жыць. - А дачкі няволіць ня буду.

АНДРЭЙ. Яно то так. Але, пакуль аб цэну таргавацца, трэба-б тавару пагляздзець.

ЯН. Пачакайце крышку: я пайду клікну яе. /Выходзіць/.

## ЗЬЯВА VII.

ЯН. /Уходзіць, вядучы засаромяўшуюся дачку; за ім ідзе Ігнась/. Ото! Пакуль мы тут, яны самі праз вакно таргуюцца. Кажы, дачка, ці хочэш Ігнася?

ГАННА. Як тата скажэце. /Падходзіць да Андрэя і цалуе ў руку/.

ЯН. Бач, якая пакорная?! А даўно то аднаго атправіла. Ну давай падвячоркаваць. /Ганна выбегае, штуркнуўшы Ігнася/.

Ну. Ігнась, седай, пагаворым.

ІГНАСЬ. /Цалуе ў руку/. Дзякую пану бацьку. /Усе паселі за стол. Ганна прыносіць лечню на скаварадзе; бацька рэжэ хлеб і кладзе перад кожным па луськце/.

АНДРЭЙ. /Налівае чарку/. Такі трэба-б было нам старгавацца

ЯН. А што нам таргавацца? Дзеці ўжо згазарыліся, а усё мае то іх будзе. Гаспадарка Ігналёка не вялікая. Дык та

брат яго управіцца,- а Ігнась пры мне будзе.

АНДРЭЙ. Ну, дык згода! Будзь, куме, здароў і дзяржыся крэпко! /Выпівае/.

ЯН. Пій на здароўе! Хай Бог дзецям памагае! /Тым часам пачынаюць зьбірацца кабеты, хлопцы, дзеўчаты/.

### З Ь Я В А VIII.

ЯН. Ну, калі і гасьцей нам Бог прыслаў, то ніхай ужо ўсім будзе весела. Хадзі, Юрка сюды. /Падходзіць шустры чэрнявы хлопец/. Схадзі, бач, скрыпку вазьмі ды нехай і Волесь цымбалы цягне.

ЮРКА. Мо і Юзіка с клярнэтам клікнуць?

ЯН. Так бегай хутчэй. А ты, Ганна, скажы Піліпу хай с клеці прынясе баклажку. /Ганна выбегае і, як бач, прыносіць разам с Піліпам місу нарэзанага сыру і баклажку з гарэлкой. За імі уходзяць музыкі, строяць інструмэнты і пачынаюць іграць. Ігнась бярэ Ганну і ідзе ў танец, прыпеваючы, а за імі другіе/.

ХОР д з е ў ч а т:

Кацілася па вуліцы белая талерка,

Слаўны хлопец, слаўны хлопец,-харошая дзеўка.

ХОР х л а п ц о ў:

На што дзеўкі рэшато

Нашто дзеўцы сіто,-

Хлопец дзеўку пацалуе,-

Дзеўка будзе сыта.

ГАННА. / Да Ігнася/.

Мая песьня уся:

Люблю Ігнася...

ІГНАСЬ. /Да Ганны/.

У горадзі гарбузы,

У Кіеві дзядзька;

За то цябе палюбіў,

Што цалуеш гладка.

/Да музыкі /.

Іграй, іграй, іграчу,

А я табе заплачу,

А я хатку прадам,

Табе грошы аддам...

/Танцуе з Ганнай. Хор утурыць апошніе словы песьні. сьля Ігнась з Ганною выходзяць з грамады і станавяцц на перадзі сцэны каля вакна/.

ГАННА. Чуеш, Ігнась як сабакі бяруць. Што там за лі па засьценку цягаецца?

ІГНАСЬ./ Пазіраючы у вакно/. Цёмна. Не відаць. Трэба выйсьці паглядзець, што там такое.

ГАННА. А цябе сабакі не парвуць?

ІГНАСЬ.Яны мяне ўжо знаюць. /Ігнась выходзіць. Ганна

глядзіць у вакно Моладзь танцуе, а старые частуюцца/.

ІГНАСЬ. /Вертаецца/. Нехта дарогаю да нас бяжыць, як жару ўхапіўшы.

ГАННА. /Пазіраючы ў вакно/. Бачу, бачу - каля загарадзі. Гэтаж нашэ ліха.

ІГНАСЬ. /Гледзячы ў вакно/. І як раз сюды зьвертае.

ГАННА. Тату, тату! Той гад ізноў к нам бяжыць. /Пачуўшы Ганну, ўсе пакідаюць танцаваць, а за імі і музыкі адзін за адным зарыгаюць ігру/.

ЯН. /Устаючы з-за стала/. Аліха-ж матары яго галаве. Хаты маей не шануе. Ой, мусіць такі прыйдзецца мне выкінуць яго за дзьверы.

ЗЬЯВА IX.

ПРАНЦІШЭК. /Бледны, ў абарванай адзежы, ў памятым капелюшы; ўскаківае на сярэдзіну сцэны/. Га, зладзеі! Гэта вы павыпускалі сабак на мяне?! Ну, заплаціце-ж вы мне за гэта.

ЯН. А егомасьць так не крычы бо тут ёсьць і старэйшые за цябе, ды такіе, што цябе супакоіць патрапяць.

ПРАН. А самі мне за адзежу заплаціце! Мала таго, што нада мною тут назьдзекаваліся, ешчэ і сабакамі нацкавалі...

ЯН. Гэта-ж ужо з гадзіну будзе, як егомасьць адгэтуль выйшоў.

ПРАН. Ужо ў канцы засьценку быў, як мяне сабакі апанавалі.

1Ба 68734

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

Пракоўскія ж і ў канцы засьценку былі?

ПРАН. Ды чыя-б там ні была, ці вашы, ці не вашы, але вы мне заплоціце, бо ў вас быў.

ЯН. Ніхто не звязаў ...

ПРАН. Палішыю пакліч. У суд пацягну...

ЯН. Баюся я, як заяц рабой кабылы.

ПРАН. Сурдут 20 рублёў і порткі 6, а капелюш 2 рублі, то разам 28 рублёў. Плаціце! А то ў суд падам і на вас, і на ўвесь ваш засьценак.

ІГНАСЬ. То мы ўсе будземо плаціць?

ПРАН. А ўжо-ж усе.

ІГНАСЬ. І за той брыль?

ПРАН. І за той.

ІГНАСЬ. /Выхапіўшы з рук капелюш/. Давай сюды! Калі маю плаціць, то нехай хаця пацешуся ім. /Кулаком прабівае брыль/.

ПРАН. Што ты робіш, дурню?

ІГНАСЬ. /Спакойна/. Што? А беларускую шапку.

ПРАН. /Сярдуючы/. Мой капелюш папсаваў.

ІГНАСЬ. А табе якое дзела? Я заплачу. Гэта ўжо мой, а ня тв

ЯН. Праўда Ігналёва. Сварыцца я с табою ня буду, дый па судох цягацца не хачу. Сам табе заплачу. Але за тое, шт ты мяне па шальмоўску хочэш ашукаць, ды хочэш злупіць 2 рублёў за тое, што каштуе 10,- кару, панічу, дастанеш

свае лапсардакі тутака на мейсцы пакінеш.

ПРАНЦІШЭК. Што?! Я паліцію! Я ў суд!

ЯН. Паліцыя тут нічога не паможэ, а на такога злодзея, як ты, суду ні Божаго, ні людзкога няма. А ну, хлопцы: разьдзеньце яго, гэтаго панічыка. /Хлопцы абступаюць і прыдзержываюць Пранцішка/.

ПРАН. /Тузаючыся/ Што?! Сурдут? Не здзірайце сурдута! А-ей! а-ей! а ей!.. Паненкі гледзяць...

АНДРЭЙ. Ніякіх тут паненак нема, адно нашы дзеўчаткі, а яны ведаюць, што чэлавек у сьвіце ня родзіцца. Хлопцы. А-ну, жыва! /Хлопцы зьдзіраюць сурдут. Пранцішэк астаецца ў манішцы на голым целе і ў рукаўчыках на голых руках. Агульны сьмех/. Глядзіце: гэта іх такая гарадзкая мода, што без кашулі ходзяць.

ІГНАСЬ. Ну, а цяпер давай, братко, і нагавіцы.

ПРАН. Ой-ой-ой-ой!.. Людцы добрые! Ратуйце! Забьюць!..

ЯН. Ціха, не крычы. А то на твой прыродны мундзір ешчэ што прыложым. А калі я за нагавіцы плачу, то і давай.

ХЛОПЦЫ. Скідай барджэй нагавіцы! Скідай! Скідай! /Адны дзержаць Пранцішка пад пахі, а другіе пачынаюць нагавіцы спушчаць/.

З а в е с а.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

сиве заподружені/ тричі за плечем підходить

ПРАНЦІШЕК. Що?/ А пастух/ А у...

ЯП. Поклади. Ці абияк не хочеш а

ям, суду ні божа. Ні кривосту прем.../ хтось превздає-

вано або панство кліпнуто. /Гладить простоту і промову прем-

вонько Праншика/.

ПРАН. /Усміхнувся/ Що? Сухари? На пальці? ступає/

А-ей.я сяла ся/. Панщині прекращу.

АНДРІЙ. Нішаах тут пашеник мама шпо прочувані/ я ани

ведавно, що ... ни подоріжі Хароша Андр-

зе./Хаюши зідзірвавий супут Праншик поклацуючи/ ...

ми на поміж цузе і в рукавичках на голих руках. Андрій

сміх/. Тенкліде... Їх така передача сода, але без

паціжі ходила.

ІГНАС. Ну, а папер давай. Гелтко, і нахоплю.

ПАН. Ох-ох-ох-ох/. Добре добре. Тогусько! Забавно!/

ЯП. Шіхо, не кричи. А то на тебе прийдуть мужиків віскочито

при сміх. А ще і за мочалими сидить то і далі

ХЛОПЕЦЬ. Склад багато кепкуйте! Ойой! Ойой!/ /Андр

рясь Праншика при ...

ступеньку/

бхбхбхбхбхбхбхбхбхбх

20000
Бел
1
1994

B00000004 13054